Вальс-эцюд М.Бергера - гэта перш за ўсе вальс, тэматычны матэрыял якога даецца ў актавах, таму перад студэнтам ставіцца задача авалодання актаўнай тэхнікай. Вобразнасць, а таксама выразнасць тэматычнага матэрыялу дазваляюць выкарыстоўваць яго ў педагагічнай практыцы.

Гаўрына Л.М.,
дацэнт

## ВЫКАНАЎЧЫ І ІНТЭРПРЭТАЦЫЙНЫ АНАЛІЗ ПРАЦЭСУ ДЫРЫЖЫРАВАННЯ ЯК АБ'ЕКТ ТВОРЧАГА ПАЗНАННЯ

Пошукі ў напрамку удасканалення тэарэтычнай базы навучання дырыжыраванню ідуць бесперапынна.

Навучанне па прынцыпу «рабі, як я» ўсе менш задавальняе педагогаў. Вядома, што практычныя навыкі лепш засвойваюцца тады, калі маюцца пэўныя тэарэтычныя веды аб іх. Кожны педагог ведае, што ён хацеў бы перадаць сваім вучням, але не кожны ведае, як гэта лепш зрабіць. Тут патрэбны канкрэтныя метадычныя рэкамендацыі. Працэс навучання дырыжыраванню абавязкова павінен абапірацца на моцныя веды аб асаблівасцях выконваемых твораў.

Дырыжор за дырыжорскім пультам - гэта апошні этап вялікай папярэдняй працы, вынік вывучэння твора, увасабленне ў жэсце задач кіравання, глыбока прадуманай і ўспрынятай музыкі. Змест музыкі не ляжыць на паверхні рукапісу. Ноты - гэта ўсяго толькі патэнцыяльная крыніца інфармацыі, структурны каркас для выканання твора. У працэсе выканальніцкага аналізу партытура як аб'ект творчага пазнання не проста «пераносіцца ў галаву», а пераўтвараецца ў ёй, пралямляецца праз вобразны строй, характар, вопыт і мастацкія ўстаноўкі дырыжора.

Літаратура па хоразнаўству і дырыжыраванню, вучэбныя праграмы па гэтых курсах дапамагаюць, але не ў той ступені, як хацелася б. Падручнікі па аналізе музычных твораў не могуць таксама цалкам задаволіць хормайстра, таму што курс аналізу музычных твораў з'яўляецца тэарэтычнай дысцыплінай, у працэсе вывучання якой проста немагчыма ўсебакова раскрыць выканальніцкае асэнсаванне музычнага твора. Пытанні выканальніцкага аналізу распрацоўваюцца зараз, галоўным чынам, з боку структуры. Метадычных рэкамендацый аб далейшых шляхах удасканальвання навыкаў аналізу музычных твораў яшчэ мала. Нявырашаным застаецца кардынальнае складанае пытанне, пытанне аб тым, як навучыць прыемам глыбокага выканальніцкага аналізу, як навучыць выкарыстоўваць разнастайныя веды, як звязаць усе гэта паміж сабою, навучыць бачыць за формай змест. Нам здаецца, што галоўным недахопам пры рабоце са студэнтамі ў вышэйшых навучальных установах з'яўляецца недаацэнка выкладчыкамі неабходнасці раскрыцця агульных філасофскіх, эстэтычных і музыказнаўчых катэгорый. Студэнты, атрымаўшыя ў сярэдняй навучальнай установе паняцце аб музычна-харавой тэрміналогіі, умеюць дастаткова лёгка арыентавацца ў такіх «клетачках» канструктыўнай тканіны твора, як рытміка, акордыка, танальны план, дынаміка і інш. Валодаючы гэтым матэрыялам, студэнт дастаткова падрыхтаваны да засваення знешніх слаёў формы. Горш ідуць справы, звязаныя з паняццем аб унутраных слаях формы, напрыклад кампазіцыяй (з паняццем функцыянальнай значнасці састаўных яе частак), вобразным строем. У асноўным студэнты не вельмі добра разбіраюцца у пытаннях жанру і стылю. А што датычыцца пытанняў зместу, якія абапіраюцца на навуковыя распрацоўкі ў эстэтыцы, да іх студэнты падрыхтаваны яшчэ менш. Вучэбны курс эстэтыкі недастаткова звязаны з музычным мастацтвам, таму і эстэтычныя паняцці ў студэнтаў даволі абстрактныя. Задача выкладчыка - канкрэтызаваць іх у адносінах да харавога мастацтва. Не раз даводзіцца бачыць на іспытах студэнтаў, якія слаба валодаюць зместам твора. У гэтым выпадку ім цяжка зразумець яго вобразную будову. Каб ліквідаваць адзначаны недахоп, трэба распрацоўваць глыбей праблематыку формы і зместу ў адносінах да харавога мастацтва, удасканальваюць методыку раскрыцця гэтых праблем пры навучанні студэнтаў.

Савіна В.П.,
дацэнт

## РАЗВІЦЦЕ ПРАФЕСІЙНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ РЭЖЫСЁРА-ПЕДАГОГА

Да здольнасцей рэжысёра-педагога мы адносім яго таленавітасць, мэтанакіраванасць, працаздольнасць, правільную самаацэнку, апантанасць, уменне вобразна адлюстроўваць рэчаістасць, фантазію, вобразную памяць, мысленне, здольнасць абстрактную ідэю раскрываць у вобразнай форме, актыўную рэакцыю на тую ці іншую з'яву, тонкую адчувальнасць, агульнае эмацыянальнае ўспрыняцце рэчаіснасці, актыўную жыццёвую пазіцыю. Сюды ўваходзяць і спецыфічныя мастацкія якасці асобы: тонкі густ, пачуццё меры, формы, рытму, паэтычнае пачуцце, здольнасць бачыць у штодзённым асаблівае, непаўторнае, а таксама комплекс спецыяльных рэжысёрскіх здольнасцей: інтэрпрэтатарскіх, пастановачных, акцёрскіх,